УЛАДЗІМІР СКАРЫНКІН

# У КАРЭЦЕ ПА БЕЛЫМ СВЕЦЕ



Уладзімір Скарынкін

# У карэце па белым свеце

Фантастычна-прыгодніцкае апавяданне

Мінск
«Юнацтва»
2000

УДК 882.6-93
ББК 84(4 Беи)6-5
С 42

Мастак С. В. ЧАРАНОВІЧ

*Для малодшага школьнага ўзросту*

Літаратурна-мастацкае выданне

**СКАРЫНКІН Уладзімір Максімавіч**

**У КАРЭЦЕ
ПА БЕЛЫМ СВЕЦЕ**

**Фантастычна-прыгодніцкае
апавяданне**

Рэдактар *У. М. Мазго*
Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *С. А. Абрамчук*

Падпісана да друку 23. 03. 2000. Фармат 60Х90 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Кудрашэўская. Афсетны друк. Ум. друк. арк.4,0.
Ул.-выд. арк. 3,23. Тыраж 3000 экз. Зак. 24.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Юнацтва»
Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.
Ліцэнзія ЛВ № 7, 20.12.1997 г. 220600, Мінск, Машэрава,11.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка на Мінскай фабрыцы
каляровага друку. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

52 — 2000
ISBN 985-05-0351-3

© У. М. Скарынкін, 2000
© С. В. Чарановіч, афармленне, 2000



Змалку я зачараваны
Небам зорным.
                    На начлег
Рэзвай рыссю конь буланы
Па дарозе пыльнай бег.



Пад віхрастым шалапутам
Бег у поле самаходзь.
Я каня стрыножваў путам
І здымаў з яго аброць.



Бульбу печаную елі
Ўжо ля вогнішча сябры.
Конікі ў траве звінелі
На пацеху дзетвары.

Тварам дагары я клаўся
На рагожу пад капой.
Доўга моўчкі любаваўся
Зорным небам над сабой.

Ззялі зоры залатыя
Ўверсе россыпамі рос.
Ды знайсці, на жаль, тады я
Мог адно сузор'е Воз.

Коўш Мядзведзіцы Вялікай
Гэтак называў айчым.
Канюшынаю і вікай
Пахла ў мораку начным.

І праз гэты сіні морак
Лёгка адшукаць было
Мне ўгары сем яркіх зорак
Там,
дзе сонейка зайшло.

Уяўляўся возам сена
Зорны Воз той ноччу мне.
Нават збітае калена
Не трывожыла мяне.

Я ўяўляў,
як хлопчык едзе
Ў гэтым возе на траве.
На сузор'і дзіўным недзе
Там, я думаў, Бог жыве.

І сабе рабіў дакор я,
Гледзячы ў начную даль,
Што ніводнага сузор'я
Больш не ведаю,
на жаль.

А касцёр у цемры бліскаў —
І ўздымаліся над ім
То чароды яркіх іскраў,
То густы блакітны дым.

Я сачыў за іх уздымам —
І шырокі Млечны Шлях
Мне здаваўся тым жа дымам,
Што гарачай бульбай пах.

Іскры вогнішча,
як зоры,
Палымнелі ўвышыні.
Я ў нябесныя прасторы
Ўзняцца марыў на кані,
Як Іван з вядомай казкі
Пра гарбатага канька.

Я сягоння з Божай ласкі
Здзейсню мару хлапчука.



* * *

Ах, як вабна ззяюць зоры
Ноччу цёмнай угары!

Фантазёры,
бузацёры,
Ласуны і штукары!
Выключайце тэлевізар —
Хопіць мульцікі глядзець.
Запрашаем я і Ліза
З намі ў космас паляцець.







Хто такая Ліза?
Гэта
Ўнучка спрытная мая.
Не патрэбна нам ракета!
Запрагу Пегаса я!

У начное неба ўзняцца
Будзе радасна для вас.
Толькі трэба ўсё ж дазнацца,
Што за звер такі Пегас.

Гэта конь такі крылаты,
Што сябруе з вышынёй.
Быў ужо не раз узняты
Я Пегасам над Зямлёй.

Не ў ракеце,
а ў карэце
Аж да ранішняй зары
Рады гойсаць па сусвеце
З вамі я,
мае сябры.

У разной карэце нашай
Месцаў шмат —
хапае ўсім.
Паспяшайцеся,
Наташа,
Насця,
Жэня і Максім.

Ад расы ўсе травы змоклі,
Пачынаюць зоры ззяць.

Фотаапарат,
біноклі
Я з сабою раю ўзяць.

Насця ў космас можа сшыткі
І алоўкі прыхапіць,
Каб эскізы
ўвачавідкі
Ўбачанага там
зрабіць.

Гляне Ліза на эскізы,
Крыкне радасна:
— Ура!
І ўсе ўпэўняцца,
што ў Лізы
Вельмі здольная сястра.



У сваёй сукенцы новай
Ліза ў космас паляціць.
Хоць ёй тры гады з паловай,
Седма Ліза не сядзіць.

*Ясамой* яе назвала
Баба Валя нездарма:
Дня няма,
каб не сказала
Харашуха:
— Я сама!

Разам са сваёю Ліндай
Побач з Насцяй сядзь,
Яўген.
Ты, па-першае, не жмінда,

Па-другое, рэкардсмен
Нашай вуліцы па бегу,
А па-трэцяе —
рыбак.
Мы пакажам Ліндзе Вегу
І завоблачных сабак.

А Наташы,
як заўсёды,
Раю ўтаймаваць свой шал.
І пра нашыя прыгоды
Весці вахтавы журнал
У палёце даручаю.

А Максіма-дабрака
Ў вечар гэты прызначаю
Я дублёрам вазака.
Як дарослы,
ён умела
Упраўляецца з канём
І на мосцік вузкі смела
Ўз'ехаў на калёсах днём.

Ні скафандры нам,
ні збруя
Не патрэбны.
А спярша
Вас да Воза давязу я,
Ці да большага Каўша.



Плакаць і нудзіцца —
сорам,
Бо праз пяць хвілін пад'ём.

Лепш давайце, дзеці, хорам
Песню звонкую спяём:

“Да Мядзведзіцы Вялікай
Мы праз момант паляцім.
Яркім Сірыусам,
Спікай
Палюбуемся затым.

Мы паднімемся да неба
І апынемся каля
Альтаіра і Дэнеба.
Не смуткуй дарма,
Зямля!



Дружны і вясёлы самы
Наш касмічны экіпаж.
Да спаткання,
таты, мамы,
Дом і край любімы наш.

Мы сягоння касманаўты!
Крылы ўгору ўзняў Пегас.
Дзякуй, космас,
што пазваў ты
Да сябе — у госці — нас.”

На сто тысяч кіламетраў
Мы ўзнясёмся над Зямлёй,
Дзе ні хмары,
ні паветра,
Ні смугі вячэрняй слой
Бачыць зоры і планеты
Нам не будуць замінаць.



Ліза родненькая!
Дзе ты?
Час паездку пачынаць.

* * *

Схамянуўся —
і ў карэце
Ў космас нас узнёс Пегас.
Так высока і ў ракеце
Не ўзляціш за гэты час.

Засталася там —
унізе —
Наша родная Зямля.
Як было цікава Лізе
На Зямлю зірнуць здаля!

Апавітая імглою,
З вышыні была відна
Летнім вечарам малою
І блакітнаю яна.

Сонца,
што яшчэ пад намі
Палымнела ўскрай Зямлі,
Не тушыла прамянямі
Зор,
якія пачалі
Ярка ззяць на небе чорным.

Бачыць неба над Зямлёй
Гэткім чорным,
гэткім зорным



Не даводзілася ёй —
Нашай Лізе кучаравай.

— Ух ты! — Жэня закрычаў.
Макс,
штo ўладкаваўся справа
Ад Наташы,
пець пачаў:

"Не ў разбітым драндулеце,
Не ў касмічным караблі —
У залочанай карэце
Узняліся мы з Зямлі.
Хуткакрылы конь Пегас
Нам пакажа свой папас.

Мы за вечар аблятаем
Неба ўпоперак і ўдоўж
І ўсе хорам заспяваем,
Трапіўшы пад зорны дождж:
Дожджык-дожджык,
секані!
Мы паедзем на кані."

Не да Льва і не да Рака
Нас касмічная шаша
Прывяла,
а да Мерака —
Знешняй зоркі дна Каўша.

Зорачкамі ў Лізы зрэнкі
Загарэліся,
а мы

Ўверх уздоўж каўшовай сценкі
Паляцелі.
Шлях прамы
Нас прывёў туды,
дзе зззяе
Цвік са шляпкай залатой,
А з цвіка таго звісае
Коўш Мядзведзіцы Малой.

— Ну гарэзы!
Хто адкажа,
Як завецца гэты цвік? —
Я спытаў у экіпажа,
Бы заўзяты масавік. —
Не губляйце часу марна.
Вас усіх чакае прыз.



— Мы пад зоркаю Палярнай! —
Насця,
што з карэты ўніз
Задуменна паглядала
І, нібыта ў дзіўным сне,
Штосьці ў сшытку малявала,
Раптам адказала мне. —
Шлях на поўнач памагае
Кожнаму знайсці яна
І невыпадкова мае
Назву сцюжную здаўна.
Называюць воссю свету
Астраномы зорку гэту.
Неба круціцца наўкола
Зоркі гэтай,
быццам кола.



Вось дык Насця!
Ты зрабіла
Нам усім такі сюрпрыз!
Ліза! Усміхніся міла
І ўручы сястрычцы прыз.
Чым даваць за пстрычкай пстрычку
Ёй,
дабра не помнячы,
Лепей пачастуй сястрычку
"Мішкаю на поўначы".
Сорам быць такою шкоднай!

Уручылі Насці прыз
Мы пад зоркай пуцяводнай
І прадоўжылі круіз.
Даляцелі да Цэфея,
Млечны Шлях перасяклі.

— Ліза! Ты, напэўна, фея! —
Усміхнуўся я,
калі
Прывяла нарэшце траса
Нас да пашы,
на якой
Пасвіў зорнага Пегаса
Месяц,
як начлежнік той,
Што раздзьмухвае заўзята
Свой касцёр,
каб не пагас.

Прывітаў свайго сабрата
Ржаннем гучным наш Пегас.

Моўчкі пастаялі коні —
Галава ля галавы.
А наўкол квітнелі гоні,
На якіх няма травы.

Аглядзеўшы важна пашу,
Жэня выгнуўся вужом:
— Можа, мы ў карэту нашу
Двух пегасаў запражом...

— І —
на радасць касманаўтам —
Паляцім яшчэ шпарчэй
На сустрэчу з Фамальгаўтам,[1]
Што за дыямент ярчэй
На лусцэ Паўднёвай Рыбы
Пералівіста гарыць,
Каб нябесныя сялібы
Яркім ззяннем азарыць? —
Я дадаў. —
Вось толькі часу
Мала ў нас... —
І я няўзнак
Для вандроўнікаў
Пегасу
Даў рукой умоўны знак.

Разагнаўся конь наш гнеды,
Рэзка ўлева павярнуў
І сузор'я Андрамеды
Разам з намі дасягнуў
За секунд, напэўна, сорак.

— Дзеці! Гляньце ўсе на рад
З чатырох бліскучых зорак, —



Кінуў я ўгару пагляд. —
Знайце,
гэта — Андрамеда!

Насця вочы падняла.
— Гэта, кажаш, "Ан-2" дзеда? —
Галасочак падала. —
Раскажы,
дзядуля мілы,
Як сузор'ем раптам стаў
Самалёт стары двухкрылы,
На якім ты раньш лятаў.

— Ха-ха-ха!
Не самалёта
Габарытныя агні
Бачыш после павароту
Над сабой ты ўвышыні.
Ахрысцілі Ан-дра-медай
Людзі шмат вякоў назад
Зоры гэтыя.
І ведай —
З іх ярчэйшая квадрат
Утварае ў небе разам
Са свяцiламі трыма,
Што запалены Пегасам, —
Макс,
які еў сухама
Ў гэты момант смачны пернік,
Насці так сказаў і сціх.



— Ты, Максім,
як той Капернік,

Неба зорнае спасціг, —
Пазайздросціла Наташа
Хлопчыку. —
А ты б не мог
Паказаць сябрам,
дзе Чаша[2],
Зорны Воўк[3] і Аднарог?[4]

— Гэтыя сузор'і варты
Ўвагі, — ён сказаў. —
Аднак
Іх знайсці без зорнай карты
Не змагу я аніяк.
Дзед Валодзя!
Дай адказ:
Карта неба ёсць у нас?

— Карта ёсць,
але не марце
Аднарога і Ваўка
Адшукаць на гэтай карце. —
Засмуціў я хлапчука. —
Ды ўсё роўна не паспеем
Мы ўсё неба аблятаць.
Як мага хутчэй з Персеем
Лепш убачыцца,
відаць.
Знайце толькі —
Воўк,
нібыта
Ў мульціку "Ну, пачакай!",
Зубы шчэрачы сярдзіта,
Даганяе Зайца ўскрай



Небасхілу і варожа
Ўслед уцекачу глядзіць,
Ды —
на радасць нам —
не можа
Касавокага злавіць.



* * *

Мы ў карэце залачонай,
Бы ў касмічным караблі,
Пад міфічнаю персонай
Праляцелі.
І калі
Ззаду нас Персей застаўся —
Даўгалыгі,
як жыраф,
Да мяне Яўген прыдраўся:
— Заплаці, дзед Вова, штраф!
Ты праехаў ля Персея,
А Пегаса не спыніў.

Апрытомнеў пакрысе я,
Сам сябе абараніў:

— Я, вядома, вінаваты.
Толькі ты мне выбачай.
Самы шчодры і багаты
На сузор'і небакрай
Паказаць хачу табе я
Як мага хутчэй.

Авен,
Леў, Персей, Касіяпея
Пачакаюць нас,
Яўген.
Да з'яўлення зорак позніх
Трэба Лізачцы заснуць.
Раю на сузор'е Вознік
Зараз я табе зірнуць.
Сам пабач:
як свечкі тыя,
Што ў саборы залацяць,
Лікі і крыжы святыя,
Зоры Возніка мігцяць.
Папрасі —
і пакатае
Ён цябе, магчыма, там,
Дзе душа твая жадае,
Толькі дай паслухаць нам
Той псалом,
якім вітае
Нас Капэла з хорам зор.
Паглядзі, як асвятляе
Зорка гэтая прастор!
Сірыус і Вега толькі
Ззяюць за яе ярчэй.

Усміхнуўся Макс,
паколькі
Звон данёсся да вушэй,
А не спеў,
нібы шумёлы
Зазвінелі пад дугой





Там,
дзе лётаюць анёлы
У апратцы дарагой.

Сапраўды каля Капэлы,
Палымнеўшай угары,
Прасвятлялі змрок згусцелы
Зоркі дробненькія тры
І нагадвалі сабою
Ў гэтым мораку начным
Мне званочкі пад дугою,
Што звіняць над варaным.



Утаропіў вачаняты
Жэня ў Возніка,
а мы
Падляцелі пад Блізняты,
Што відны сярод зімы
Лепей,
чым спякотным летам.
Бы двукроп'е,
ззялі ў іх
Зоркі дзве.
— Двукроп'ем гэтым, —
Зноў Максім здзівіў усіх, —
Кастар з Полуксам спрадвеку
Палымнеюць над Зямлёй
І спрыяюць чалавеку,
Над калыскаю чыёй
Ззялі ў першы дзень Блізняты.

— А я ведаю —
яны. —



Загарэўся твар у Наты, —
Зеўса грознага сыны.

— Максу і Наташы —
слава! —
Левым вокам падміргнуў
І пад Полуксам направа
Я Пегаса павярнуў.

Лінда,
што дасюль махала
Задаволена хвастом,
Нечакана забрахала,
Быццам недзе пад кустом
Зайца ўбачыла на ўзлессі
Ці каля маркоўных лех.
Ды гучаў у паднябессі
Надта глуха гэты брэх.

Жэня выструніўся брава
І прызнаўся:
— На каго
Брэша Лінда —
знаць цікава.
Я ж не ведаю таго.

— Ты, —
я Жэню растлумачыў, —
Хоць на вочы не слабак,
На вялікі жаль,
не ўбачыў
Над сабою злых сабак,
Што бягуць за Арыёнам.

Меншы з іх не надта злы.
Яркай зоркай Працыёнам
Ганарыцца хорт малы.
Зубы вышчарыўшы,
трусіць
Хорт вялікі перад ім.
Люты і клыкасты,
мусіць,
Запраста ваўкам усім
Глоткі ён перагрызае.
Сірыус,
як медальён,
У харта на шыі ззяе.
З зорак —
самы яркі ён!
Прытаіўся дзесь паблізу
Тут і Заяц. —
Прыгарнуў
Да сябе я ўнучку Лізу
І Пегаса павярнуў
Зноў у бок той самы —
правы.
Крыламі махнуў Пегас —
І адсталі ваўкадавы
Ненажэрныя ад нас.

Від надзіва маляўнічы
Ўзнік —
на радасць ласунам.
З лукам зорны паляўнічы
Перайшоў дарогу нам.

Папрасіў я мяккім тонам
Лізу на яго зірнуць





І сказаў,
што Арыёнам
Гэтага стралка завуць.
Меў той лучнік падабенства
З літарай лацінскай “Z”.

— А ты ведаеш з маленства
Назвы ўсіх сузор’яў, дзед? —
Ліза міла запытала.

Адказаў я шчыра:
— Не!
У дзяцінстве надта мала
Зор было вядома мне.

Ліза глянула ўтрапёна
На мяне,
пасля туды,
Дзе ў сузор’і Арыёна
Палымнелі зоркі тры.
Як рубін,
адна з іх ззяла,
А другая —
як тапаз.
Трэцяя нам нагадала
Самы дарагі алмаз.

— А якія ў зорак назвы? —
Заінтрыгаваў я ўсіх. —
Што ж! Запамінайце,
раз вы
Захацелі ведаць іх.

Гэта зорка —
Бетэльгейзэ,
А вось гэта —
Белятрыкс...
А цяпер, Лізок, пагрэйся
Чаем і салодкі твікс
З'еш хутчэй,
бо ты, здаецца,
Згаладалася зусім.

— А як трэцяя завецца? —
Перабіў мяне Максім.



— Чуць такія словы горка.
Я спытаць хацеў у вас,
Як завецца тая зорка,
Што блішчыць,
нібы алмаз.
Як-ніяк,
а гэта ж Рыгель —
Зорны вогненны калос, —
Я здзівіўся.
— Рыгель-шпігель, —
Насця буркнула пад нос.

Ззяў прыгожа і шырока
Арыён і ў цьме начной
Велічнасцю вабіў вока.
Ды заўважыў над сабой
Раптам новы зорны ўзор я,
Бо дарога прывяла
Да наступнага сузор'я —
Да Цяльца,
інакш — Вала.



Над аціхлымі дамамі
Гэтак,
як і Арыён,
Ззяе зімнымі начамі
Асабліва ярка ён.

А над ім густое Сітца[5]
Плямкаю з драбнюткіх зор
Ледзьве ў цемрадзі свіціцца,
Быццам прысакам —
касцёр.

Праз бінокль вайсковы Жэнеў
Паглядзелі мы —
і нас
Яркім бляскам апраменіў
Жар,
які амаль пагас.

Вол нагадвае ракету,
Што імчыцца ўвышыні.
І відны ўсяму сусвету
На бартах яе агні.

Бліснуў колерам чырвоным
Найярчэйшы з тых агнёў.
Незвычайны бляск ягоны
Ў захапленне ўсіх прывёў.

— Што за зорачка міргнула,
Бы чырвоны святлафор? —
Ната Макса штурханула. —
Мо наперадзе затор —

І далей нам нельга ехаць?
Дзе мы, адкажы, ляцім?

Нетаропка,
                    быццам нехаць,
Наце адказаў Максім:
— Нам чырвоным святлафорам
Падміргнуў Альдэбаран.
Зор такіх не ведаць сорам!

Я ж дадаў:
                    — Ай ды баран,
Хто дасюль Альдэбаранам
Пацікавіцца не мог.
Выязджаць прыйшла пара нам
На даўжэйшую з дарог.
Мы на Млечным Шляху зноўку.
Ён, нібы праспект, —
                    прамы.
І па ім сваю вандроўку
Будзем з вамі доўжыць мы.
Над палямі,
                    над лясамі
Неўзабаве ад Цяльца
Мы па Млечным Шляху з вамі
Панясёмся да Стральца.

Радасцю сябрыну нашу
Азарыла навіна.
Толькі гордую Наташу
Не цікавіла яна.

Прыкусіла губы Ната
І не праяўляла гарт,



Бо яе пакрыўдзіў надта
Мой не вельмі ўдалы жарт.

Мне таксама прыкра стала,
Што яе пакрыўдзіў ён,
А яна закрыўдавала.



— А, між іншым,
                    Працыён,
Рыгель, Сірыус, Капэла,
Полукс і Альдэбаран, —
Макс —
                    з усмешкай, зразумела, —
Выпрастаў свой гібкі стан, —
Шасцікутнік утварылі.
Бетэльгейзэ —
                    цэнтр яго.

І мы песню сачынілі
Пра таварыша свайго:

“Хоць у геаметра Макса
За душой няма ні бакса,
Ведае затое Макс,
Што такое паралакс.
Падарылі сёння Максу
Ваксу мы і таксу Кляксу.
А яшчэ падорым,
                    Макс,
Мы табе японскі факс.”



* * *

Млечны Шлях —
праз неба траса,
На абочыне якой
Пасвіў месячык Пегаса
Ноччу ліпеньскаю той,
Як малы хлапчук,
што ў прыску
Бульбу сопкую пячэ.

Шмат праменных зорак зблізку
Ўбачым мы на ім яшчэ,
Бо ўвесь Млечны Шлях наогул —
Проста скопішча свяціл,
Што нагадвае дарогу,
Над якой клубіцца пыл.
А людзям паганскай веры,
Што жылі даўным-даўно,
Малаком багіні Геры
Уяўлялася яно.

Глянеш праз бінокль уночы
Ўважліва на Млечны Шлях —
Болей зор убачаць вочы,
Чым расінак у палях.

Мы спазнаем з вамі тайны
Той шашы,
дзе пад адхон
Колісь падаў сын адчайны
Бога сонца — Фаэтон.
Лейцы рукі шаляніцы

Не ўтрымалі —
і на дол
У бацькоўскай калясніцы
Ўпаў няўдалы балагол.
Сонцам,
што сядзела ў футры,
Ледзьве дол не падпаліў
Падшыванец белакуры
І Зямлю не спапяліў.

І Капэлу па сусвеце
Гэтым трактам дзень пры дні
Возіць Візнік у карэце
У міжзорнай вышыні.



Гэта ўсё я для даведкі
Вам, гарэзы, расказаў,
Бо, магчыма, нехта,
дзеткі,
З вас таго яшчэ не знаў.

Да Персея праставалі
Мы дарогаю прамой
І на ўвесь сусвет спявалі
Песню новую гурмой:

"Ярка-ярка свеціць зорка
Над развілкамі дарог.
Наш малы сусед Ягорка
Спіць даўно без задніх ног.
Гарцаваў між гор Ягор
І не паляцеў да зор.



Бачыць праз блакітны морак
Зноў у сне бягун-хітрун,
Як яго нясе да зорак
Даўгавухі конь-гарбун.
І не ведае,
што ў нас
Ёсць крылаты конь Пегас.

Мы ў палёт касмічны скора
Зноў адправімся на ім.
Толькі ўжо не без Ягора,
А з Ягорам паляцім.
Гляне зблізку і Ягор
На сухвецці яркіх зор."

А тым часам, як і ўсе, я
Ўбачыў раптам над сабой
Зноў магутнага Персея,
Што з Кітом вёў колісь бой.
Вой з усмешкаю на твары
Ў гэты момант уявіў,
Як ад жудаснай пачвары
Андрамеду бараніў.
Эфіопскаю царэўнай
Не пасілкаваўся Кіт.
Справіўся з пачварай гнеўнай,
Праявіўшы рэдкі спрыт,
Волат,
што па свеце белым
На Пегасе гарцаваў.
Кіт страшэнны скамянелым
Востравам у моры стаў.


ЗОРНАЕ НЕБА
КІТ
ВАДАЛЕЙ
РЫБЫ
ПЕГАС
КАЗЯРОГ
Гамаль
АВЕН
ЭРЫДАН
АНДРАМЕДА
Алголь
ЗАЯЦ
Рыгель
КАСІЯПЕЯ
ПЕРСЕЙ
ЦЯЛЕЦ
Альдэбаран
АРОЛ
Альтаір
ЛЕБЕДЗЬ
Дэнеб
Белятрыкс
Капэла
АРЫЁН
ЦЭФЕЙ
Бетэльгейзэ
ВОЗНІК
ЛІРА
Палярная зорка
Вега
ВЯЛІКІ САБАКА
СТРАЛЕЦ
МАЛАЯ МЯДЗВЕДЗІЦА
БЛІЗНЯТЫ
МАЛЫ САБАКА
Сірыус
ЗМЯЯ
ДРАКОН
РЫСЬ
Кастар
МЛЕЧНЫ ШЛЯХ
Полукс
Мегрэц
МЛЕЧНЫ ШЛЯХ
ГЕРКУЛЕС
Мерак
РАК
Працыён
ВЯЛІКАЯ МЯДЗВЕДЗІЦА
ЗМЕЯНОСЕЦ
ГАНЧАКІ
ЗМЯЯ
ПАЎН. КАРОНА
ВАЛАПАС
Рэгул
Антарэс
Арктур
ЛЕЎ
КОМПАС
СКАРПІЁН
ГІДРА
ДЗЕВА
ШАЛІ
Спіка

Бог уратаваў Персея.
Маладому смельчаку
Аддалі Касіяпея
І Цэфей сваю дачку,
У якой чарней,
                    чым сажа,
Валасы былі.
                    Зірнуў
Я на членаў экіпажа
Патаемна і адчуў
Незвычайную пяшчоту
Да сяброў сваіх малых
Па касмічнаму палёту,
Ды сказаць пра гэта ўслых
Не паспеў,
                    бо ў момант гэты
Вылецела,
                    як страла,
Ліза шустрая з карэты
І адразу пачала
Аддаляцца ад павозкі.
Вось дык гора!
                    Вось дык жах!
У чуллівай Насці слёзкі
Заблішчэлі на вачах.



Гэткай жудаснай падзеі
Не чакаў ніводзін з нас.

Вёз каля Касіяпеі
Нас Пегас
                    у гэты час.



Што ты, Лізачка, зрабіла
З родным дзедам і сястрой?
Ці ты, любая, забыла,
Што мы ў космасе з табой?
І няўжо хтось не паможа
Нам цябе перахапіць?
Хоць усё ў жыцці быць можа,
Гэтага не можа быць,
Каб вярнуўся я з круізу
Без унучкі любай.
                    Гэй!
Можа, ты паймаеш Лізу,
Эфіопскі цар Цэфей?

Ды цара,
                    які ў ахвяру
Ўласную дачку прынёс,
Каб спыніць Кіта-пачвару,
Не цікавіў нечы лёс.
Цар,
                    які стаў пастаяльцам
Неба зорнага,
                    рашыў
Нам не памагаць.
                    Ён пальцам
Нават не паварушыў.

— Памажыце нам хто-небудзь! —
Перайшоў я зноў на крык.
І прыгожы зорны Лебедзь
Раптам перад намі ўзнік.
На яго хвасце палала
Зорка яркая Дэнеб.

Птах праклекатаў:
— Кідала
Гэтая дзяўчынка хлеб
Родзічам маім з плаціны
У Ждановічах зімой.
Лізу ўратаваць —
адзіны
І галоўны клопат мой.

Белыя тугія крылы
Ўскінуў Лебедзь над сабой
І праз міг памчаў штосілы
За дзяўчынкаю малой.
Птах удзячны праз хвіліну
Лізу бедную дагнаў,
Пасадзіў сабе на спіну,
Побач з намі залунаў.

У карэту зацягнулі
Уцякачку мы ўпяцёх
І з палёгкай уздыхнулі:
Скончыўся перапалох!

Вочы ўратаванай Лізы
Выпраменьвалі святло,
Быццам жудаснай рэпрызы
Ў небе зорным не было,
Бы ў яе не трапятала,
Не сцікалася нутро.
У руцэ яна трымала
Лебядзінае пяро!

— Што ты, Ліза, нарабіла? —
Запыталі мы гурбой. —



Ці ты, любая, забыла,
Што мы ў космасе з табой?

— Я да мамы захацела,
А над галавой якраз
Шыльда “М” заблiскацела
Нечакана ў гэты час, —
Левай ручкай непаседа
Моцна сціснула пяро. —
Я падумала,
што гэта
Наша Мінскае метро,
І таму сышла з павозкі.

Скончыўшы,
зрабіла крок
Ліза да сястры і слёзкі
Ў Насці выцерла са шчок,
Каб і ёй адчаю цені
Не азмрочвалі вачэй.
Пасадзіў я на калені
Ўнучку меншую хутчэй.

— Ведай,
фея-дабрадзея,
Змалку вартая паэм:
Над табой Касіяпея
Зззяла літараю “М”,
Быццам уваход падземкі, —
Я тлумачыць Лізе стаў.
А Яўген:
— Ты любіш семкі? —
У дзяўчынкі запытаў.

Ліза глянула на Жэню
І кіўнула галавой.
Хлопчык добры семак жменю
Ў прыгаршчы насыпаў ёй.

Лізе ў вочы зазірнула
І шурпатым языком
Ручку Лізіну лізнула
Лінда добрая цішком.
Насця сыпанула ў місу
Ліндзе корму "Педзігры"
І паставіла пад пысу:
— Не саромся —
на, бяры!

Саўладалі мы з трывогай!
Стала дзецям весялей.
З песняй зорнаю дарогай
Мы памчаліся далей:

"Анідзе дабрэй,
чым Лінда,
Вы не знойдзеце сабак,
Хоць і даў мянушку Рында
Ёй сусед —
былы марак.

Мы сяброўкай лічым Лінду.
І яна пацалаваць
Можа кожнага,
хто лінду
Навучыўся танцаваць.





Нораў у баксёркі Лінды
Не баксёрскі,
хоць яна
І не любіць тых,
што лынды
Б'юць ад ранку да цямна."

На акрыленым Пегасе
Мы імчалі.
Прывяла
Нас дарога ў хуткім часе
Да вялікага Арла.

Плыў Арол па Млечным Шляху
І на Лебедзя глядзеў,
Што насустрач злому птаху
Над Лісічкаю[6] ляцеў.



Насця гучна,
бы сарока,
Раптам як заверашчыць:
— Гляньце ўсе,
як ярка вока
У драпежніка блішчыць!

— І зусім не вока гэта.
Гэта зорка Альтаір,
Што праменіцца ўсё лета, —
Ссунуў шапку набакір
Жартаўнік Максім,
якога
Ў планетарый я вадзіў,



Дзе спазнаў даволі многа
Ён астранамічных дзіў.

Ды адна бяда не ходзіць.
Сумна ёй,
калі адна.
І бяду другую водзіць
Следам за сабой яна.

Хоць наперад поўным ходам
Наш Пегас імчаўся сам,
Нашым жартам і прыгодам,
Нашым запаветным снам
На бясконцым Млечным Шляху
Раптам надышоў канец,
Бо навёў нямала страху
Там, наперадзе, Стралец.

Лучнік той зусім не злюка,
Ды ў нябесную імглу
Ён пусціў з тугога лука
Смертаносную Стралу[7].

Хоць Стралец у Скарпіёна
Цэліўся,
яго Страла
Ў бок Змяі і ў бок Дракона
Адхіляцца пачала.
Зорны Шчыт[8] яна прабіла
І бліскучым вастрыём
Ледзь крыло не зачапіла,
Распасцёртае Арлом.

* * *

Разварот ля Альтаіра
Мы зрабілі —
                і ляцім.
Заблішчэла злева Ліра
З яркім вогнішчам сваім.

— А я знаю —
                        гэта Вега! —
Жэня з гонарам сказаў,—
Аднакласніка Алега
Брат яе мне паказаў.

— Малайчына! —
                        я Яўгена
За падказку пахваліў
І цукеркаю "Селена"
Фантазёра надзяліў.



— Вось дык вогнішча!
                                Такога
Не распальваў нават дзед.
А куды вядзе дарога? —
Крыкнула на ўвесь сусвет
Насця,
            зззяючы ад шчасця
Зноў заранкай залатой.

І сказаў я:
                — Зараз, Насця,
Мы ляцім да зоркі той,
Да якой прымацавана
Ручка большага Каўша.



Ды зусім неспадзявана
Ў Насці сцялася душа,
Бо Дракон праплыў над намі
З велізарным жыватом,
Са страшэннымі вачамі
І завостраным хвастом.

Не крануў нас трыбухаты,
Бо ўцяклі мы ад яго.
І заржаў наш конь крылаты
Пераможна:
                — Іго-го!

А Дракона,
                што кідаўся
Ў небе нам наперарэз,
Ды за намі ўсё ж застаўся,
Доўбняй стукнуў Геркулес.

З жудасных вачэй Дракона
Іскры шуганулі ўміг —
І Паўночная Карона
Утварацца стала з іх.

Ззяе гэтак камянямі
Імператарскі вянец.
А праз пяць хвілін над намі
Цьмяна заблішчэў Мегрэц.

Астраномамі названа
Гэтак зорка,
                да якой
Наглуха прымацавана
Ручка кварты незямной.



Зорачкамі ў Лізы зрэнкі
Загарэліся,
а мы
Ўніз —
уздоўж каўшовай сцэнкі —
Паляцелі.
Шлях прамы
Вёў у гэтыя хвіліны
Нас туды,
дзе палымнеў
Ярка сілуэт ільвіны,
Ці іначай —
зорны Леў.

Паглядзеў ізноў пяшчотна
Я на штукароў малых,
Што ляцелі бесклапотна
Між сузор'яў залатых,
І падумаў:
"Ці заўсёды
Дагаджаць ім будзе лёс?
Ці патушаць непагоды
Ў іх вачах святло нябёс?

У няславе ці ў пашане
Жыць наканавана ім?
Кім Яўген,
кім Насця стане?
Кім Наташа і Максім?"

Несур'ёзна і нязвязна
Я расказваў пра сяброў.
Апішу больш падрабязна
Я маленькіх штукароў.

Жэня —
зух і неўвярэда,
Вёрткі,
жвавы весяльчак.
Хлопчык —
выхаванец дзеда,
Што пра кошак і сабак,
Пра янотаў і пра заек
Піша для малых дзяцей
Кніжкі мудрыя.
Празаік
Дзед Яўгенаў,
карацей.
І Яўген —
гуманітарый.
Кажуць,
ён у дзеда ўвесь.
Шмат музеяў,
дэльфінарый
З ім наведаў дзед Алесь.
Хлапчукоў-бібліяфілаў
Я такіх яшчэ не знаў.
Ля кастра пра Радзівілаў
І пра Грунвальд расказаў
Ён цікавага нямала,
Бо чытае змалку шмат.
Як сястра яго казала,
Наш Яўген —
чытач-фанат.

Насця з Натай прачыталі
Кніг не меней,
чым Яўген.





Іхнімі сябрамі сталі
Колас,
Караткевіч,
Твэн.
Возьме Насця мандаліну —
Ахнеш:
— Гэта ж віртуоз!

А Наташа з пластыліну
Зляпіць вам букет мімоз.
І яшчэ яны мастачкі!
А героі іх карцін —
Лапавухія сабачкі,
Коні, козы, кот Марцін.
Любяць танчыць і смяяцца
Сакатухі,
а калі
Надыходзіць ноч —
ім сняцца
Рыцары і каралі.

Макс таксама ў нас фанатык.
І фанат яшчэ які!
Ён фанатык-матэматык,
Як ягоныя бацькі.
Трапіць ён у катакомбы
Ці ў нагорныя лугі —
Паралелаграмы,
ромбы,
Трохвугольнікі,
кругі
І трапецыі паўсюдна
Уяўляюцца яму.

І завуць яго прылюдна
Геаметрыкам таму.



Роздумам сваім, магчыма,
Падбухторыў незнарок
Я фанатыка Максіма.
Так,
як вызубраны ўрок
Іншы раз чаканіць школьнік,
Ён сказаў:
— Няма патрэб
Гаварыць,
што трохвугольнік
Вега-Альтаір-Дэнеб
Летне-восеньскім завецца,
Ды не ўсе да гэтых дзён
Усвядомілі, здаецца,
Што прамавугольны ён...

Нечакана ў момант гэты
Сціх фанатык-фантазёр,
Бо над намі разагрэты
Хуткім рухам метэор
Яркаю ракетай бліснуў
І ў сузор'і Рака згас.
І здалося нам,
што свіснуў
Зорны Рак у гэты час.

Пра Дэнеба і пра Вегу
Больш не думала дзятва,
Бо наперадзе ззяў Рэгул
Яркім кіпцюром Ільва.



* * *

Толькі пад сузор'ем Рака
Метэора след пагас:
— Нас дамчаў да задыяка, —
Насця крыкнула, —
Пегас!
Гэта значыць,
гэта значыць,
Што павінен як-ніяк
Нам дзед Вова растлумачыць —
Што такое задыяк?

— Гэта шлях праз небасхілы.
Рухаюцца пакрысе, —
Я пачаў, —
па ім свяцілы
Сонечнай сістэмы ўсе.
Карацей, гасцінец гэты —
Траса,
па якой штогод
Сонца,
месяц і планеты
Робяць свой кругаварот.
Сходзіцца са Шляхам Млечным
Задыяк там,
дзе Цялец
Стаў даўно цялём бяспечным
І дзе свеціцца Стралец.
Не па дзюнах і нагор'ях,
Не па гонях і палях —
Па дванаццаці сузор'ях
Наш праляжа з вамі шлях.



З радасцю была прынята
Дзецьмі гэта навіна.
Толькі Ната,
толькі Ната
Не ўсміхнулася.
Яна
Зноў свае надзьмула шчокі
І, суняўшы ўласны шал,
Моўчкі,
бы рабіла ўрокі,
Штось запісвала ў журнал.

І таму я праз хвіліну,
Каб усталяваўся лад,
Позірк на дзяўчынку кіну,
Азірнуўшыся назад.

— Глянь, Наташа!
Перад намі, —
Закрычаў я, —
задыяк.
І на ім мігціць агнямі
Ярка Леў —
твой зорны знак.
Шляхам Марса і Венеры,
Шляхам Сонца праставаць
Будзем па нябеснай сферы
Мы і весела спяваць.
Весялей зірні наўкола,
Дарагая Наталі!
Вось табе і кока-кола.
Хочаш — смагу наталі.
Я прапанаваць гатовы

Нават фанту,
нават спрайт,
Толькі б усяго два словы
Ты сказала нам:
"Ол райт!"
Зноў пасябраваць пара нам,
Цудатворніца мая,
Бо назваў цябе баранам
Не ўсур'ёз,
а жартам я.
Жартаваць заўсёды гжэчна
Абяцанне я даю.
Не хавай так недарэчна
Эрудыцыю сваю.
Распагодзься на хвілінку,
Хопіць стрымліваць свой шал.
Надта ж сумна безупынку
Весці вахтавы журнал.
Не крыўдуй.
Скажы хоць слова.
Не маўчы,
як тая мыш.
Леў і Тыгр адначасова,
Як усім вядома,
ты ж, —
Я ўзмаліўся вінавата.



Твар дзяўчынкі пасвятлеў.
Паказала зубы Ната,
Пачала раўці,
як леў:
— Я, між іншым,
заяўляю:



Зносіць больш такіх абраз
Не хачу і дазваляю
Кпіць з сябе апошні раз!
Задыяк —
стары "гасцінец"
Для крыўляк і задавак.
Ну а для мяне звярынец
Той жа самы задыяк.
Каб не спаганялі зверы
На наведвальніках злосць,
Клеткі ёсць у ім,
вальеры.
І акварыумы ёсць.
Можаце ў звярынцы смела
Ўсё што хочаце рабіць.
І, між іншым,
я б хацела
Ў ім экскурсаводам быць.

— Так яно і будзе!
Згода!
Бо каму,
як не табе,
Лепш тут быць экскурсаводам, —
Я ўступіў яе мальбе.

— Толькі коратка і бегла
Ты экскурсію праводзь,
Каб у ложак Ліза легла
Ў час, —
дадаў я мімаходзь. —
Вахтавы журнал Яўгенам
Будзе весціся цяпер.

Можа, стане нашым Твэнам
Ён ці майстрам,
як Мальер.

— Вось і даляцелі,
дзеткі, —
Рэй павёў экскурсавод, —
З вамі ўрэшце мы да клеткі,
Дзе не слон,
не бегемот
Змешчаны,
а Леў кудлаты.
Чуеце,
як ён зароў?
Гучна свішча Рак вусаты
Справа ад цара звяроў.
Больш не хочацца з Гераклам,
Пэўна, сустракацца ім.
Да акварыума з Ракам
Мы, аднак, не паляцім,
Бо знаходзіцца ў ім сонца —
І мы ўсе аслепнем там.

Быў я ўзрушаны бясконца
Словамі,
якія нам
Толькі што сказала Ната.
Праз хвіліну акурат
Эрудытка,
хітравата
Глянуўшы,
дала загад
Рэзка павярнуць улева
Наш утульны экіпаж.





Я ў адказ:
— О каралева!
З радасцю Ваш верны паж
Выканае волю Вашу.
Іншым позіркам зусім
На шчаслівую Наташу
Ўпотай паглядзеў Максім.

Часам тым аднекуль спевы
Сталі далятаць да нас.

— Гэта значыць,
што да Дзевы
Нас ужо дамчаў Пегас.
Гаспадыняю звярынца
Тут з'яўляецца яна
І пра маладога прынца
Ад відна і да відна
Марыць веснімі начамі
З яркай Спікаю на лбе, —
Хітра бліснула вачамі
Ната,
верная сабе.

— А, між тым, —
узвысіў голас
Жвавы Жэня ў гэты міг, —
Рэгул — прынц,
а Спіка — колас.
Мне вядома гэта з кніг.

Вочы Дзевы запрашалі
У звярынец незямны,

А за Дзевай зорнай Шалі
Ўбачылі адразу мы.

— Гэтым залатым бязменам
Вызначае вагаўшчык —
Колькі важаць Рак з Авенам,
Колькі Леў і колькі Бык[9].
Важыць Рыб і Скарпіёна
На бязмене гэтым ён, —
Ната крыкнула ўтрапёна. —
Зрэшты, вось і Скарпіён!
На хвасце яго Антарэс
Ззяе чырванню,
як Марс.

І ўзнялі гарэзы галас,
Быццам вадэвіль ці фарс
У тэатры мы глядзелі
Пра вясёлага ўдальца.

А тым часам даляцелі
Мы ў карэце да Стральца.

І дала экскурсаводка
Ўласным вуснам і рукам
Зноў свабоду,
каб каротка
Растлумачыць сябрукам:
— Там,
дзе злы Стралец пануе,
Мы знаходзімся цяпер.
Ён кентаўр,
які пільнуе,
Каб не ўцёк ніводзін звер.





— Гэта ён у Скарпіёна
Цэліўся,
але Страла
Ў бок Змяі і ў бок Дракона
Адхіляцца пачала.
Потым зорны Шчыт прабіла, —
Я дадаў, —
і вастрыём
Ледзь крыло не зачапіла,
Распасцёртае Арлом.



А міжзорная дарога
Неўзабаве прывяла
Нас усіх да Казярога,
Ці да воднага казла,
Што залеву з ураганам
На людзей наклікаць мог.

— Алімпійскім богам Панам
Быў калісьці Казярог,
Ды страшэннага Тыфона[10]
Ён сустрэў каля ракі
І ў ваду тырчма з адхона
Скокнуў,
бы казёл які, —
Зноў пачуўся голас Наты. —
Стаў рагаты,
як казёл,
І, як рыбіна,
хвастаты
Горнай рэчкі навасёл.

На раскрыленым Пегасе
Паляцелі мы далей —



І заззяў у хуткім часе
Перад намі Вадалей.

— Гэта волат,
што заўзята
У акварыумы лье
Тут ваду, —
рукою Ната
На бліскучае калье
З дробных зорак паказала. —
Вось акварыум для Рыб, —
Потым нам яна сказала. —
Першая з іх любіць глыб,
А другая —
верхаводка...

Я ж пачуў у гэты міг,
Як пасопвае салодка
Ліза на руках маіх.

— Што ж ты,
рыбачка-маркіза,
Абяссілела зусім?
Зараз мы з табою,
Ліза,
Да Авена даляцім,
Рэзка ўлева зноў павернем
Там,
дзе свеціцца Гамаль,[11] —
Я сказаў, —
бо сном вячэрнім
Ты ўжо зморана, на жаль,
І на зорным Валапасе,

Што нагадваў стратастат
Мне заўжды,
у хуткім часе
З неба вернемся назад
Да тваёй любімай мамы,
Што нам дранічкі пячэ.
Да Блізнят і да Вала мы
Потым злётаем яшчэ.

— А я тату дарагому
Лебядзінае пяро
Падару,
калі дадому
Зноў прыеду на метро, —
Ліза з соннымі вачамі
Выдала сябрам сваім.



— Як шкада,
што сёння з вамі
Мы далей не паляцім.
Толькі ведайце:
Блізняты
Служаць брамнікамі тут, —
Зноў пачуўся голас Наты.

— Ты, Наташа, проста цуд!
Хто б экскурсію такую
З нас яшчэ правесці мог, —
Я дзяўчынку трапяткую
Пахваліў. А конь улёг
Да Арктура —
яркай зоркі
У сузор'і Валапас.



— Штукары і фантазёркі! —
Я сказаў. — Шкада,
што вас
Мы пакінем неўзабаве,
Што без нас учацвярых
Вы ў завоблачнай дзяржаве
Між сузор'яў залатых
Гойсаць будзеце і скора
Абляціце свет кругом.
Макса як свайго дублёра
Прызначаю вазаком.
Больш няма ніякіх,
Ната,
У цябе кандыдатур?
Стаў гандолай стратастата
Ўжо аранжавы Арктур.
Сядзем з Лізай мы ў гандолу
І з нябёсаў пакрысе
Ў ёй апусцімся да долу,
Дзе адбіліся ў расе
Зноўку залатыя зоры,
Што бліскочуць угары.
Да спаткання,
фантазёры!
Да сустрэчы,
штукары!
Шчыраю,
непаказною
Я любоўю вас люблю.
З Лізай,
стомленай яздою,
Апусціцца на Зямлю

Трэба нам,
пакуль адкрыты
Мінскі метрапалітэн.
Крыж Паўднёвы знакаміты
Ты сфатаграфуй,
Яўген,
І ў журнале дэталёва —
Як пісьменнік! —
апішы.



Ты ж заўсёды знойдзеш слова
Шчырае і ад душы.
Да спаткання,
Лінда-Рында!
Ты чаму, скажы, злуеш?
Я ж, як і Яўген,
не жмінда.
На, кілбаскі скрылік з'еш!
Дзякуй вам,
Яўген і Насця!
Дзякуй,
Ната і Максім!
Колькі радасці і шчасця
Вы прынесяце маім
Чытачам,
калі па свеце
Пажадаюць і яны
Ў пазалочанай карэце
Пракаціцца ў час начны.
Быў бы я бясконца рады,
Каб нябеснае святло,
Як і вашы,
іх пагляды
Зорным ліўнем заліло.



ISBN 985-05-0351-3